Тамара Бярэзіна



# МІЖ АБАВЯЗКАМ І СУМЛЕННЕМ

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Тамара БЯРЭЗІНА

# МІЖ АБАВЯЗКАМ І СУМЛЕННЕМ

вершы

2024

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 014

**Бярэзіна Т.І.**
Між абавязкам і сумленнем : вершы / Тамара Бярэзіна. — Мінск : МАА СПБ, 2024. — 54 с. (Электронная бібліятэка).

© Бярэзіна Т.І., 2024
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2024

***

Ад продкаў скарб з сабой нясу,
Які цаной невымяральны:
У мове адчуваць красу.
Яна мне адкрывае тайны.

У мове гэтай – смак і пах,
З маленства блізкі і знаёмы.

***

Вечар весні,
Сэрцаў песня,
Мар імклівы карагод.

Душы насцеж,
Крылы шчасця
І няўрымслівы палёт.

Кветак водар,
Прахалода,
Музыка рачной вады.

Ціхай ласкай,
Дзіўнай казкай
Праімчаліся гады.

За лясамі,
За гарамі
Іх схаваліся сляды.

**На Нарачы**

Вецер у соснах гуляе раздольна,
Шумам яны, сустракаючы госця,
Успамінаючы важнае штосьці,
Песню спяваюць над берагам вольна.

Бераг аблашчаць азёрныя хвалі:
Бачылі шмат -  не забыта нічога.
Доўгая ў часе людская дарога…
Возера хвалямі ціха ўздыхае.

***

Раніцай водар вясновых садоў
Май удыхае на поўныя грудзі,
Слухае ранішні спеў салаўёў
І акунаецца ў казачным цудзе.

Хораша рознай парой на зямлі,
Але вясна над усім уладарка.
Міг – дрэвы хутка ў садах адцвілі,
Міг – і юнацтва пранеслася  шпарка.

Толькі вясны незабыўнай цяпло
Вабіць сваёю пяшчотай і грэе.
Сонца вакол разлівае цяпло,
Шлях па жыцці асвятляе надзея.

***

Ўскрай дарогі ў жыце васількі,
А дарога ўецца да ракі.
Пад мастком драўляным – плёскат хваль.
Плынь ракі імкнецца хутка ўдаль.
Беражок у травах лугавых,
Музыка прыроды лашчыць слых.
Скрозь блакіт бясконца трапяткі:
Неба сінь, рака і васількі.

***

За рэчкаю ў туманах патанула
Майго юнацтва зорнае святло.
Жыццё старонак шмат перагарнула,
За годам год з вадою адплыло.

Што страчана з мінулымі гадамі,
Хоць не забыць, але і не вярнуць.
Успамінанні тоўпяцца, як здані
І з ценю часу моўчкі паўстаюць.

Дзе будучыні сонечныя промні
Не захінулі часу халады,
Дзе шчасце ў прыгаршнях свяціла поўняй,
Не ведала хвілін ліхой бяды.

***

Па расістых травах на світанні рана
Выйшла з ценю ночы лета пагуляць.
Новая сукенка ружамі прыбрана,
Стужкі ад вясёлкі сонечна блішчаць.

Расцвіталі краскі, дзе ступалі ногі,
І ляцелі поруч дружна матылькі.
Запрашалі ў госці ўсе шляхі- дарогі,
Зіхацелі хвалі звілістай ракі.

На рушнік паклаўшы каравай гасцінна,
Сустракала лета дарагіх гасцей,
Пела песні ўдала вольнаю часінай
Пад мігценнем яркім зорачак- вачэй.

І ніхто не ведаў, як шчыруе лета
Ад начы дарання, зрання дацямна.
У гародах, лесе, на сухіх палетках
Сілы пакідае ўсе свае да дна.

***

Неба сінь і мора глыбіню
У тваіх вачах удумных бачу,
А яшчэ кахання цеплыню
Для сябе ў сэрцы я адзначу.
Позірк твой раскажа ўсё без слоў,
Што душа таемна адчувае,
Пра каханне, шчырую любоў
Сэрца, як у кнізе прачытае.

**Максіму Багдановічу**

Ціхая прага кахання,
Вострая смага жыцця,
Сумная горыч расстання,
Зорны палёт пачуцця.

Роднай старонцы адданасць,
Замілаванасць красой,
Працай душы апантанасць,
Сентыментальны настрой.

Скрушная ў сэрцы трывога,
Творчае думкі размах,
Між палынамі дарога –
Горкі, бязлітасны шлях.

Шлях хоць кароткі, ды зорны,
І, адляцеўшы ў сусвет,
Светлай душой непаўторнай
Сэрцы хвалюе паэт.

***

Дарога жыццёвая нітачкай ўецца,
Няпростым каханнем жыццё наша тчэцца.
Чым станецца ў выніку гэтае ткацтва –
Дзяружкай звычайнай ці творам мастацтва?

**Ракуцёўшчына**

Дзе здаўна пяе крынічка,
І сінеюць васількі,
Час пранёсся яркай знічкай,
Плынню гаманкой ракі.

Засталіся для нашчадкаў
Вершаў чулыя радкі,
Што выходзілі так гладка
З-пад Максімавай рукі.

І ліюцца хваляй песні –
Непаўторныя радкі,
Што на лёгкіг крылах неслі
Трапяткія матылькі.

**Уладзіміру Караткевічу**

Ён быў і ёсць, і, несумненна, будзе:
У творах бессмяротная жыве душа.
Бясцэнны скарб, які пакінуў людзям,
Бясспрэчна, будзе іх духоўна ачышчаць.

У радасці і ў роспачы, і ў скрусе
У памяці нашчадкаў будзе вечна жыць.
Не аддзяліць яго ад Беларусі,
І Беларусі ад яго не аддзяліць.

12.02.2020

## Скарб спадчыны

*Памяці дарагога*
*дзядулі П.І. Бітэля.*

Жыцця дарога праз завалы,
Праз церні і праз руднікі
У мудрым сэрцы захавала
І эстафетай праз вякі
Сваю жыццёвую навуку,
Што так ашчадна зберагаў,
Нашчадку ў спадчыну, унуку
З любоўю шчодра перадаў:
З павагай стаўся да чужога,
Цікаўся, думай, вывучай.
Куды б ні прывяла дарога,
Не забывай пра родны край.
Скарб спадчыны мне сэрца грэе,
Я ведаю святы закон жыцця,
Той, што ніколі не старэе:
Сваё любі да самазабыцця.

## Зімой

Ужо сцямнела на двары,
Натужна вые завіруха,
А вецер з даху снег дзярэ
І ўніз, на дол шпурляе глуха.

У такую непагадзь люблю
Цяплом ад печкі саграваіца,
Забыць пра спячую зямлю
І ў думках да вясны вяртацца.

***

Творы мастака,
паэта,
кампазітара,
як дзеці.
У кожным –
душы часцінка,
думкі іскрынка,
часу старонка.
Будзе жыць памяць
пра аўтара
ў яго творах,
якія пяройдуць
да новых пакаленняў,
у новы час,
як застылыя імгненні
жыцця,
І яскрава раскажуць
пра яго.

**Кветкі восені**

Міла адцвітаюць восеньскія кветкі,
У чаканні першых прымаразкаў стынуць.
Лета залатога дажываюць сведкі:
Жаль бярэ, што хутка прыйдзецца загінуць.

Яркасцю пялёскаў мне душу сагрэюць,
Цеплынёю фарбаў прынясуць спакой,
Перш, чым ад марозу краскі пачарнеюць,
І зіма накрые ледзяной рукой.

## Слова

*У пачатку было слова…*

Слова бывае markdownрознае:
Добрае, злое, грознае.
Мамінай ласкай светлае,
Сонца ўсходам прыветнае,
Ветру павевам свежае
Лётае па-над межамі.
Цяжкім бывае , пякучым,
Каменем ляжа балючым,
Цісне душу, не грэе,
Холадам лютым вее…
Слова нясе нас на крылах,
Добрых яднае і мілых.
Стане сцяною ад злога
Мірнае, мілае слова.

## ***

Год стары амаль ужо мінае,
На парозе Новы год стаіць,
Нашага жыцця тамы чытае,
А яно ідзе, бяжыць, ляціць!
Дзень прайшоў – старонка прачытана,
Год мінуў – закрыт наступны том…
Колькі кніг яшчэ не напісана?
Колькі шчэ лісткоў перагарнём?

**Лілея**

На азёрнай гладзі серабрыстай,
У цішы глыбокай і густой
Нарадзіўся цуд прыроды чысты –
Цвет лілеі белай і святой.

Залатое сонца лашчыла пялёсткі,
А вада жывіла шчодра чысцінёй,
Вецярок ласкава заплятаў ёй коскі,
Возера люляла хваляю жывой.

Той, каму пашчасціць прыгажуню ўбачыць,
Спыніць крок свой шпаркі, справы адкладзе,
У цішы ўдумнай будзе любавацца,
Як гайдаюць хвалі кветку на вадзе.

***

Твая душа – параненая птушка,
Імкнецца да святла і да кахання.
Твая душа – параненая птушка,
Бо не адчула радасць пакаяння.
Тваю душу вазьму ў свае далоні,
Сагрэю сэрцам я яе гарачым.
Тваю душу вазьму ў свае далоні,
Няхай яна спявае, а не плача.
Твая душа напоўніцца пяшчотай,
Растане лёд, што сэрца так сціскае.
Твая душа напоўніцца пяшчотай,
І светлы птах твой крылы распрастае.

***

Мілая Радзіма!
На тваіх абшарах
Маладосць рунее
Чысцінёй святой.
Хай мароз і сцюжа
Замацуюць дружна
Шчырыя памкненні
Сілы маладой.
Навальніц не бойся,
І парой вясновай
Ты імкніся к свету.
Будзе Бог з табой,
Каб дажджом абліты
І сагрэты сонцам,
Важкі колас выспеў
Летняю парой.

***

“Як складаеш вершы?” –
Хтосьці запытае…
Як я іх складаю,
І сама не знаю:
Можа, іх навее
Ветрык лёгкакрылы,
Можа, дождж
На крылах
Хмарачкі гуллівай
Прынясе знянацку,
Нечакана пырсне
Словам на паперу,
Кроплямі на лісце.

**Чысціня душы**

*Лідзіі  Гардынец*
*з нагоды прэзентацыі*
*кнігі “Ад твайго парога”*

Чым саткана тое слова,
Што запала ў душу,
Што малюнкам светлай мовы
У сэрцы я сваім нашу?

Дзе  вытокі той крыніцы,
Што да мора дабяжыць,
Дзе збіраліся суніцы,
Без чаго так пуста жыць?

Пах раллі, узнятай плугам,
Сее сэрца дабрынёй,
Песня, што плыве над лугам,
Разлілася шырынёй.

Ад парога роднай  хаты
І ад бацькавай касы
Тыя вобразы ўзяты
Непаўторнае красы.

Глыбіня нябёс блакітных
Васількамі на палях,
І па травах аксамітных
Басаногі першы шлях…

**Зімовы цуд**

Што за цуд на дрэве голым
Пасярод зімы сівой:
Кропкі “яблыкаў” чырвоных
У мяне над галавой.

І з галінкі на галінку
Пераскочыў “яблык” жвава,
А праз нейкую хвілінку
Узняліся ўсе рухава.

І, падаўшы голас звонкі,
Праляцелі ўгары
Дружна яркаю чародкай
Птушкі-госці – снегіры.

***

Радзіму любяць, бо яна свая,
Не будзе роднаю чужына.
Выток жыцця навек адзіны.
Радзіму любяць, бо яна свая.
Карэннем моцная Айчына,
Няма той сілы па чужых краях.
Радзіму любяць, бо яна свая,
Не будзе роднаю чужына.

03.11.2018

**Настаўнікам нашым**

*Тыя, у каго мы вучымся,*
*правільна называюцца*
*нашымі настаўнікамі,*
*але не кожны, хто вучыць нас,*
*заслугоўвае гэта імя.*
*І.Гётэ*

У жыцці настаўнікаў нямала
Кожнаму сустрэць з нас давялося.
Я лічу, што мне пашанцавала,
Хоць ужо не за гарамі восень.

Памяць захавала да драбніцы
Галасы і рухі іх, і твары.
Нас вучылі ўсё жыццё вучыцца
І ісці насустрач светлым марам.

Глыбіню і веліч роднай мовы
Нас вучылі адчуваць і бачыць,
Карыстацца беларускім словам,
Разумець яго святую значнасць.

Прыкладам сваёй руплівай працы
Кожны дзень давалі вучням многа,
Бо сваёю большасцю, зазначу,
Педагогамі былі ад Бога.

Са спазненнем шчырая падзяка
Ў гарачым сэрцы ўзнікае…
Нам цяпер само жыццё адзнакі
Кожны дзень няўмольна выстаўляе.

**Трывога**

Час ляціць імкліва –
Падрастаюць дзеці,
Сто дарог адкрыта
Ім на белым свеце.

А ў маці сэрца
Поўніцца трывогай,
Просіць яно ласкі
Для дзяцей у Бога.

Туманом трывога
Засцілае вочы,
І няма спакою
Ні ўдзень, ні ўночы.

Сэрца супакояць
Дарагія словы:
- Не хвалюйся, мама,
Я жывы, здаровы!

***

Чараўніца восень зноўку жарты строіць:
Блісне промнем сонца з-за хмурын цяжкіх,
З кроплямі тугімі вецер дождж прыгоніць,
А з-за хмар вясёлка з’явіцца ўміг.
Восень рассыпае золата на кроны,
На зялёным фоне чырвані сляды,
А праз нейкі месяц лес паўстане голы,
Цёмны,непрывабны, шэры і пусты.

## Раніца жыцця

Вясёлкай ўсміхнуўся май,
Удзячны спорнаму дажджу,
І спевам адгукнуўся гай,
А я на кветкі ўсё гляджу:
Сады, як вэлюм маладой,
А бэз шыкоўны і густы,
Абліты дажджавой вадой,
На сонцы зіхацяць кусты.
І пара птушак маладых
Сярод лістоў будуюць дом –
Гняздо-калыску для малых,
Дзе не дастануць дождж і гром.
Май – гэта раніца жыцця,
Калі спяваюць салаўі.
У сэрцы мора пачуцця –
Пачатак шчасця для дваіх.

## Зімовая замалёўка

На акне зімовым Дзед Мароз малюе
Серабрыстым пэнзлікам ледзяны ўзор.
Навагодняй казкай сэрца зачаруе,
Заварожыць позірк дзіўным светам зор.

Як малюнак сонца светам прыласкае,
Залатыя промні шчасцем зіхацяць,
Казачнае дзіва нібы ажывае,
І лісты-расліны быццам шапацяць.

Як зімовы вечар за акном устане,
Холадам павее таямніца шкла –
Сінява загадкава праз  узоры  гляне…
Ну, а нам прысніцца,што вясна прыйшла.

**Пейзаж**

Я намалюю казачны пейзаж,
Што ў сэрцы нараджае ўяўленне,
Як у пустыні  дзікай той міраж,
Які абудзіць шчырае здзіўленне.

Пазычу фарбаў у блакіце неба,
Аблокаў пышнай пенай ажыўлю,
Бурштынавага сонца промні трэба,
Каб сагравала грэшную зямлю.

Цяплом ад сонца намалюю кветкі,
Травою аксамітнаю – лугі,
А коўдрай з латак – пышныя палеткі
І росамі – крынічкі берагі.

Бляск сонца адлюструецца ў сіні
Азёр цудоўных і павольных рэк,
І песня чуецца ў ціхай плыні,
Што сэрцам успрымае чалавек.

***

Белыя воблачкі вішань у цвеце,
Водар салодкі вясновых садоў…
Вэлюмам лёгкім пяшчотных суквеццяў
Майскі пейзаж зачароўвае зноў.
Момант дзівосны – душы асалода –
Пышнай квяцістасці майскай красы,
Зноў падарыла матуля прырода
Спеў шматгалосы і срэбра расы.

***

Белы, пульхны, лёгкі, чысты
Снег засыпаў урачыста
Дахі, дрэвы і кусты,
Асвяжыў усе платы.
Дзіўным, казачным карункам,
Нібы зімкі пацалункам,
Прыласканы, пабялёны
Ёлкі, ліпы, сосны, клёны.
Нібы лебедзь сваім крыллем,
Далягляд увесь накрыла
І накрылася сама
Той пярынаю зіма.

***

Чаму для мамы вершаў не пішу?
Таму, што слоў патрэбных не хапае,
Каб закрануць пачуццямі душу,
Такімі, што я сэрцам адчуваю.

Усю сям'ю, як сімвал-абярэг,
Жыццём сваім ад бед засцерагае,
І з душаў нашых прынімае грэх –
Малітваю сваёю ачышчае.

Дык да жа, Божа, як мага даўжэй
Жыцця зямного сцелецца дарога!
Хай лёс матуляў нашых беражэ,
Бо маміна любоў – любоў ад Бога.

**Дзе шукаць шчасце**

Дзе яно – шчасце, хто нам падкажа?
Хто яго знойдзе і ясна раскажа,
Дзе адшукаць яго, дзе зім сустрэцца,
Каб напаўнялася радасцю сэрца.

- Шчасце ў каханні, сэрца тамленні, -
Моладзь любому адкажа ў здзіўленні.
Хто можа быць шчаслівей за каханых,
Звязаных лёсам, душою адданых?!

Шчасце ў ладзе сямейным і згодзе,
Доме, дзе цёпла і пры непагодзе,
Дзетках, што радуюць бацьку і маці,
У нараджэнні ў сям і немаўляці.

- Шчасце ў здароўі, - хворы рассудзіць,
Бо як здаровы, нічога не нудзіць –
Весела зробіш любую работу,
Хоць працаваў аж да сёмага поту.

Шчасце ў кожным дзянёчку пражытым,
Сонечным светам ласкава аблітым,
Воблачках лёгкіх і хмарках бягуткіх,
Часу імгненнях няўлоўных і хуткіх.

***

Шчаслівы той, хто шчасця не шукае
У хуткай плыні бурнага жыцця
Шчаслівы той, хто тонка адчувае
Законаў строй духоўнага быцця.

Багаты той,  каму ўсяго хапае,
Хоць многага не меў усё жыццё.
Багаты – хто чужога не чапае,
Хто дзеліцца найлепшым пачуццём.

Той бессмяротны, хто жыве аддана,
Хто за другіх жыцця не шкадаваў.
Той будзе вечна жыць, хто апантана
На ніве ўсенароднай шчыраваў.

**Марозны дзень**

Сіняй раніцай прачнуўся
Дзень марозны і румяны,
Зоркам ясным усьміхнуўся
І закрочыў па палянах.

Па лясных звярыных сцежках
Захацеў ён прагуляцца,
Па ўзгорках, па ўзлесках
Сонейкам пакрасавацца.

Ён па соснах і ялінах
Чыстым снегам заіскрыцца,
Па зімовых ручаінах
Па лядочку прабяжыцца.

**Снежань**

Снежань снегам замятае,
Ахінае, укрывае,
Засцілае пакрывала,
Каб зямля адпачывала.

Ён наставіў ля ракі
Гурбаў белыя стажкі.
Рэчка тугенька спавіта,
Снежным полагам накрыта.

Дрэвам новае ўбранне
Снежань падарыў уранні:
Футры з белае кудзелі
Сосны стромкія надзелі.

А бярозкі маладыя
Снег з пяшчотаю прыкрые.
Каб марозу не баяцца,
Трэба цёпла апранацца.

***

Не трэба на жыццё нам наракаць,
Бо гэта Богам нам наканавана,
Выпрабаванні з гонарам трымаць.
Не трэба на жыццё нам наракаць,
Ва ўсім сабе не трэба патураць,
Гаіць душэўныя патрэбна раны.
Не трэба на жыццё нам наракаць,
Бо гэта Богам нам наканавана.

**Санет**

Вясны дыханне абудзіць гатова
Сухое зерне, кінутае на раллю.
Жывое моцнае адвечнае” люблю” –
Адметнае загадкавае слова
Святлом сагрэе сэрца адмыслова,
Па жылах разліе салодка цеплыню,
Аддаўшы прамяніста-шчодра дабрыню,
Жыцця прамені выпырсне нанова.

Галоўны сэнс прыроды ў адраджэнні,
І рух яе ў адвечным абуджэнні.
Любоўю Боскай зноўку свеціць сонца,
І выцякае з гэтага выснова:
Жыццё павінна доўжыцца бясконца,
Каханне і любоў – яго аснова.

***

Калі ты побач – добра мне,
Калі няма цябе – сумую,
У думках вобраз твой малюю.
Калі ты побач – добра мне,
Хоць часта на цябе крыўдую.
Расстанне доўгае міне.
Калі ты побач – добра мне,
Калі няма цябе – сумую.

***

Чаму так хутка час ляціць,
Напэўна, штосьці гэта значыць.
Ніхто не можа растлумачыць,
Чаму так хутка час ляціць.
Нічога нельга перайначыць,
Як дадзена, так будзем жыць.
Чаму так хутка час ляціць,
Напэўна, штосьці гэта значыць.

***

Між абавязкам і сумленнем
Усё змяшчаецца жыццё.
У дзейнай працы ўсе быццё
Між абавязкам і сумленнем.
Перададзім, як адкрыццё,
У дар наступным пакаленням:
Між абавязкам і сумленнем
Усё змяшчаецца жыццё.

**Хоку**

*

Пчала лятае
каля змерзлых кветачак –
хоча былога.

*

Вясёлка ў небе
рознакаляровая,
як мост у вечнасць.

*

Кветка кахання
не ў кожным садзе цвіце,
бо дзівосная.

*

Маленства – святло,
што асвятляе жыццё,
хоць і здалёку.

*

Падаюць зоркі,
лаві іх у далоні –
мары спраўдзяцца.

*

Месяц бліскучы,
начны нябесны ліхтар –
намеснік сонца.

*

Яблык пад дрэвам
пабіўся пры падзенні –
расчараваўся.

*

Рабіна плача –
чырвоныя ягады
слязьмі падаюць.

*

Адбіваюцца
зоркі ў пацерках расы,
радасна блішчаць.

*

Матылькі ляцяць
пялёсткамі кветачак,
што перацвілі.

*

У галінах дрэў
раскалыхаўся месяц,
як у калысцы.

*

Паляна ў лесе
чырвоная ад суніц-
блішчаць зоркамі.

*

Хутка схаваўся
слімак у ракавіне-
домаўладальнік.

*

Рагаты месяц
зачапіў рогам хмарку -
узрадаваўся.

*

Месяц у небе
не можа злічыць зоркі-
разбягаюцца.

**Вянок санетаў**

1.
Сціраюць хвалі на пяску сляды,
Дзе некалі з табой гулялі мы,
Здалёк міргаюць вокнамі дамы…
Цяпер не вернемся ізноў туды.

Бывае – не пазбавіцца нуды:
Былое адляцела, як дымы,
Як пасля буры шумныя грамы,
І мора ўспамінаецца тады.

Змяняе ўсё навокал часу бег,
Кранае скроні серабрысты снег.
Бяссоннымі бываюць часта ночы.

Танюткім месяц свеціцца сярпом.
Гляджу на зоркі, не заплюшчу вочы:
Плывуць аблокі ў небе за акном.

2.
Плывуць аблокі ў небе за акном.
Сад разам з намі моцна пастарэў,
Вятрамі лісце пазрывана з дрэў,
Перад зімой заснуў працяглым сном.

У шыбы восень стукае дажджом,
Увысі чую аднастайны спеў,
Там роўны клін журботна паляцеў,
З радзімым развітаўшыся гняздом.

Маркотнае хвалюе развітанне,
На доўгі час з Айчынаю расстанне.
Каб быў шчаслівым іхні пералёт,

Жадаю птушкам не слабець крылом,
Бо цяжкім будзе дальні іх палёт,
Не ведаюць, дзе знойдуць мілы дом.

3.
Не ведаюць, дзе знойдуць мілы дом,
Не стане роднаю чужына,
На ўсё жыццё адна Айчына.
І птушкі адлятаюць ланцужком.

Грамы хай не зачэпяць іх крысом.
Зіма – адлёту іх прычына:
Марозам выжыць немагчыма.
Ляцяць праз мора і ўначы, і днём.

Буйныя хвалі пеняцца, шумяць,
Ніхто не можа сілу іх суняць.
Стыхіі дзікай воля правіць баль,

Не пакідае на шляху сляды.
Бязмежная спрадвеку кліча даль –
Які пагоніць вецер і куды.

4.
Які пагоніць вецер і куды…
Так думы нашы вольныя ляцяць,
Іх не спыніць, не сцішыць, не суняць.
Яны імкнуць праз час і праз гады,

Таўкуцца ў галаве туды-сюды.
Чужую сутнасць цяжка разгадаць,
Па гэтым не патрэбна сумаваць –
У справах мрояў тайныя сляды.

Пра ўсё на свеце можна развважаць,
Палёт фантазіі не затрымаць.
Збіраюцца гуртом аблокі,

Плывуць, не ведаюць ліхой бяды,
У край іх панясе далёкі –
Збяруць тугія хмары халады.

5.
Збяруць тугія хмары халады,
Яны ў дарозе моцна падрастуць,
Паўнеба крыллем змогуць ахінуць,
Падобныя да сіней барады.

Пужаючы здалёку гарады,
Пагрозу за сабою панясуць,
І злосць сваю агністую збяруць,
Гайдаючы на ветры правады.

Але не ўчыняць аніякай шкоды,
Прайшоўшы ўсе блуканні і прыгоды,
Пасунуцца няхуткаю хадой.

Адважна страсяне іх гулкі гром –
Абрынуцца на дол жывой вадой,
І выліюцца на зямлю дажджом.

6.
І выліюцца на зямлю дажджом
Аблокі, стаўшы цяжкай хмарай,
А для зямлі – жаданай марай:
Напіцца вільгаці з нябёс нагбом.

Зазелянее далягляд кругом,
Парушацца маўкліва чары,
Туманы лягуць на папары,
Прасторы ахінуць сівым плашчом.

Прырода ажыве бунтоўнай сілай,
Луг квеценню закрые сэрцу мілай.
Вясны дзянькам чароўным рады мы.

І прыйдзе Юр'я з казачным ключом
Зямельку адмыкаць пасля зімы,
Раскатамі цяжкімі грымне гром.

7.
Рскатамі цяжкімі грымне гром,
Прыедзе гулка ён на калясніцы,
Здалёк засвецяць уначы зарніцы,
І наваколле задрыжыць кругом.

Абмыюцца вясёлкавым дажджом
Муроў спрадвечных вежы-камяніцы,
І зазвіняць бруістыя крыніцы,
Ласкава поўнячы зямлю жыццём.

Святая памяць у душы паходняй
У вечных думах аб старонцы роднай.
Як разгадаць стагоддзяў таямніцы?

Далей кудысь адыйдуць халады.
Паветра ачышчаюць навальніцы,
Маланкамі пужаючы заўжды.

8.
Маланкамі пужаючы заўжды
Лугоў квяцістыя абшары,
Паўзуць з-за лесу велічныя хмары,
Нясуць чаканай дажджавой вады.

Змывае дождж засохлыя сляды –
Спякоты разганяе злоснай чары.
З душы жыццёвыя адкінь удары,
Што лёс з дарогі збочыў не туды.

Перад табой на выбар вольны шлях,
Ты лёс трымаеш у сваіх руках,
Аблокі ж падуладныя вятрам,

Хоць восень на зямлі, хоць звонкі май,
Ці будуць верныя сваім краям,
А можа адляцяць за неба край.

9.
А можа адляцяць за неба край
Твае сыны з Радзімы на чужыну,
Сваю пакінуць мілую краіну
Шукаць сабе чужы жыцця ручай.

Адкрытасці за морам не чакай,
Душа не знойдзе там спачыну,
Завяне кволаю раслінай
Без песень, што пяе птушыны гай.

Вясной да гнёздаў чарада спяшае,
Вяртацца іх ніхто не прымушае.
Карэння ад зямлі не адрывай.

Айчыне нельга здрадзіць, цвёрда знай.
Падумай, блудны сын, не адбывай,
Як птушак чарада ў паўднёвы рай.

10.
Як птушак чарада ў паўднёвы рай
Імкнуць у высь народных спеваў гукі,
За імі следам дрэвы цягнуць рукі,
Квітнее па-вясноваму наш край.

Ты песня шчырая, вышэй лунай,
Няхай яе пяроймуць нашы ўнукі…
Пасля зімовай зацяжной разлукі
Народ птушыны праслаўляе май.

Спяваць ад сэрца – асалода.
Плыве ў паветры свежы водар.
Зіма прайшла. Як цёпла – не бяда!

Вясна дадому спевакоў вяртае,
Бо кожны год крылатых грамада
З Радзімы на чужыну вылятае.

11.
З Радзімы на чужыну вылятае
Пад восень бусел – пералётны птах.
Адвечны доўгі і далёкі шлях
Бясспрэчна, кожны раз яго чакае.

На развітанне над гняздом кружляе,
Падзівіцца. Што робіцца ў лугах.
Ці адбыліся змены на палях,
Як гаспадар, што з дому ад'язджае.

Сваіх дзяцей паставіў на крыло,
За гэты час і лецейка сышло.
Ні дзень, ні два прадоўжыцца палёт.

Прыйшла пара Айчыну пакідаць.
Шмат праляціць бароў, лясоў, балот.
І ціха заблішчыць марская гладзь.

12.
І ціха заблішчыць марская гладзь,
Як сонца з неба яснае засвеціць,
Вясёлкі дзіўны бляск яе расквеціць,
А мора будзе цішу калыхаць.

Душа чулліва хоча заспяваць,
І верыцца, што лёгка ў цэлым свеце,
Гуляюць, радуюцца дружна дзеці,
А сэрца напаўняе дабрадаць.

У выніку стваральнай працы
Стаяць пясчаныя палацы.
Пейзаж цудоўны цешыць вока.

Расслаблена народ адпачывае.
Там не даймае моцна спёка,
Дзе ветрык лёгка з хвалямі гуляе.

13.
Дзе ветрык лёгка з хвалямі гуляе,
Бярозкі адбіваюцца ў вадзе,
На беразе ў сяброўскай чарадзе
Стаяць. Іх бокам рэчка ахінае.

Аерам левы бераг абрастае,
Там хат вясковых не відаць нідзе,
Дарогай палявой стары брыдзе,
Цямнее лесу паласа жывая.

Пакошаны бязмежныя лугі,
Сухое сена складзена ў стагі,
Яны стаяць, як шапкі велікана.

Ніводнай хмаркі ў небе не відаць,
Прырода ўсё аблашчыла старанна,
І разліецца цішы дабрадаць.

14.
І разліецца цішы дабрадаць.
Займае дух ад прыгажосці,
Адразу разумееш штосьці,
Пра што зусім не ўмееш расказаць.

Прамені будуць бераг казытаць –
Ласкавыя, без нуднай злосці,
Жаданыя зямлёю госці,
Не перастануць сэрца хваляваць.

Пяшчотная, кранальная сустрэча,
Пагожы, трапяткі, ружовы вечар,
Юнацтва адплыло з вадой.

Вяртаюся ўспамінамі туды,
Дзе маладосць была са мной…
Сціраюць хвалі на пяску сляды.

15.

Сціраюць хвалі на пяску сляды,
Плывуць аблокі ў небе за акном,
Не ведаюць, дзе знойдуць мілы дом,
Які пагоніць вецер і куды.

Збяруць тугія хмары халады.
І выліюцца на зямлю дажджом,
Раскатамі цяжкімі грымне гром,
Маланкамі пужаючы заўжды.

А можа адляцяць за неба край,
Як птушак чарада ў паўднёвы рай
З Радзімы на чужыну вылятае,

І ціха заблішчыць марская гладзь,
Дзе ветрык лёгка з хвалямі гуляе,
І разліецца цішы дабрадаць.

18.02.2021

***

Сонца на захад хавацца збіраецца,
Тым, хто змарыўся, пара адпачыць.
Цветам ружовым зара разгараецца,
Ззяе на захадзе і зіхаціць.

Месяц на небе прыняў эстафету-
Зоркам пастух, а прыродзе ліхтар.
У неабсяжным прасторы сусвету
Згас ужо сонца вячэрні пажар.

Сцішана дыхае ветрык ласкавы,
Ціха лісточкамі ён шапаціць.
Зорныя пацеркі мераюць травы,
Месяца светам рачулка блішчыць.

**Летні дожджык**

Летні дожджык прамяністы
Прыляцеў на хмарцы чыстай,
Па вясёлцы пракаціўся,
На траве засерабрыўся.
Лёгкі, дробненькі, лагодны,
Цёплы, ціхенькі і плодны
Ажывіў усё навокал,
Асвяжыў як кінуць вокам,
Прыпыніўся на імгненне,
Азірнуў у захапленні
Наваколле, травы, кветкі,
Духмяністыя палеткі,
Атрымаў задавальненне
І прапаў у аддаленні.

**Новы дзень**

Месяц свеціць паміж зоркамі,
Зоркі слаба зіхацяць,
Па-над лесам над узгоркамі
Светам срэбраным блішчаць.

А з-за лесу над туманамі
Разгараецца зара.
Сонцу рухацца румянаму
Надышла якраз пара.

Расчасала сонца косы,
Распусціла над ракой,
Асвяціла мякка росы,
Разліло вакол спакой.

Новы дзень ступіў пяшчотна,
Абдымаецца з зарой.
Ранак цешыцца вільготны,
Захапляецца красой.

***

Волаты-дрэвы каля гасцінца –
Сведкі сівой даўніны
Бачылі многа, што і не сніцца,
Ды не раскажуць яны.

## З каханнем па жыцці

Я кахаю, я кахаю –
Сэрца стукае ў грудзях,
Без яго жыцця не маю,
Без яго – бяскрылы птах.

Я кахаю, я кахаю –
Расставання не хачу,
З мілым я бяды не знаю,
З ім на крылах я лячу.

Я кахаю, я кахаю –
Добра разам нам заўжды,
Наша шчырае каханне
З намі доўгія гады.

## Цёплы ўспамін

У прывольнай далі па жыцця дарожках
Бегала дзяцінства на маленькіх ножках,
У дзіцячым ложку спала бесклапотна,
А матулі рукі лашчылі пяшчотна.

Яркае юнацтва пела песні звонка,
Слухала іх шчыра родная старонка.
Першыя пачуцці па вадзе вянкамі
Шчасця-долі сталай для сябе шукалі.

Зараслі-прапалі даўнія дарогі,
Па якіх хадзілі маладыя ногі.
Цёплым успамінам цешыць памяць сэрца,
Песняю птушынай у душу праб'ецца.

***

У кожнага свая калыска –
Свой родны дом, свой мілы край.
У памяці заўсёды блізка
Свая рачулка, ціхі гай,
Маленства чыстага дзянёчкі:
Язмін і бэз – вакол спакой,
У травах кветак сініх вочкі
Мігцелі яснай дабрынёй.
Загадкі, свету спасціжэнне,
Вясёлка ў небе, дождж грыбны,
І спелыя суніцы ў жмені…
Навек у памяці яны.

***

Бальзамны водар дзікіх траў,
Птушыны шчэбет на прыволлі
З дзяцінства ў палон забраў
І ўсё жыццё заве на волю.
Туды, дзе кругам гарызонт
І далягляд як кінуць вокам,
Дзе неба лёгкі парасон
У высь сягае за аблокі,
Дзе пад вясёлкавым мастом
Маленства светлае лятала,
Дзе пад матуліным крылом
Цяпла і ласкі ўсім хапала.

**Пакланюся сваёй Беларусі**

Мне нічога чужога не трэба,
Прырасла я да роднай зямлі,
Дзе пад чыстым сінеючым небам
Моц даюць мне мае карані.

Вабіць некага сонечны вырай,
Асляпляе нязвыклай красой,
Мне ж усмешкай сяброўскаю шчырай
Ззяе луг серабрыстай расой.

Тут сляды пахаваліся ў травах,
Асалода ў багатых лясах,
Захапленне ў цяністых дубравах,
Шырыня і прастор на палях.

Я вады жыццядайнай нап'юся
З невычэрпных народных крыніц.
Пакланюся сваёй Беларусі,
Што блішчыць арэолам зарніц.

***

З гары высокай над ракою
Муры касцёла і царквы
Глядзяць у велічным спакоі,
І сведчаць: Дух Святы жывы.

**Іду…**

Насустрач зіме праз туманную восень,
Праз стомлены вечар. А лісцем заносіць
Сляды, што шматкроп'ем жыццё рассыпае.
І снег ужо белы мяне сустракае
На дрэвах, на дахах, на скронях ссівелых
Надзейных сяброў праз жыццё пастарэлых,
З сабою нясу страт цяжкіх груз нязводны,
Набыткаў цудоўных, душы неабходных…
Іду…

***

Прыроды загадкі, яе таямніцы
Спрадвеку служылі для казак крыніцай.
Жывуць у народзе легенды, паданні,
Дзе цуды і чары, прывіды і здані.

Вадзянікі зрэдку вадзіліся ў рэках,
У лесе лясун сустракаў чалавека,
Русалкі ў азёрах плялі свае сеці,
Пра іх знালі ўсе: і старыя, і дзеці.

Чароўных паданняў плылі карагоды,
На хвалях гайдалі іх чыстыя воды,
Пра папараць-кветку, што ў лесе красуе,
Ды толькі знайсці яе штось не шанцуе.

Уражвае твораў народных багацце…
Увечары дзецям расказвала маці,
Што чула калісьці даўно ад бабулі,
І слухалі дзеці, пакуль не паснулі.

***

Ніхто не нап'ецца са студні пустой,
І песні сапраўднай няма без глыбіняў,
Зачэрпнеш з народнай крыніцы Святой –
Парадуе слова чароўнаю плынню.

Яно забруіцца ракой залатой,
Якая расквеціцца промнямі сілы,
Адродзіць паніклыя душы сабой,
Дасць моцы душэўнай убогім, панылым.

Бурлівым патокам гатова размыць
Заторы абрыдлага снегу і лёду
І вынесе з пустак халоднай зімы
На шлях да чаканай вясны, на свабоду.

***

Якое шчасце мець сяброў,
Што вернасць праз гады пранеслі!
Успомнім разам зноў і зноў
Пра шлях жыццёвы, што як песня.

А ў песнях месціцца душа,
Яна мацнее і сталее,
У песнях сум і палкі шал,
Вясны цяпло, зімы завея.

Капрызны лёс падорыць нам
І боль, і радасць, і ўспаміны.
З сябрамі дзелім папалам
Жыцця сумесныя хвіліны.

***

Мне настальгічныя прыходзяць думы
Пра тое, як змяніўся свет вакол.
Гляджу на ўсё з непрыхаваным сумам,
Кладу на вагі розніцу вякоў.

Сышоў наш час, і даўняе мінула,
Жыццё люблю ўсё роўна, як тады…
Шмат добрага, што сэрца закранула,
З сабой забралі хуткія гады.

Знаёмай песняй памяць сэрца сцісне,
Мінулым дням няма назад хады.
Маланкай успамін выразны блісне,
Але наноў не зробіць маладым.

Для кожнага ўспаміны маладосці,
Як жыццядайны сонечны прамень,
Як дарагія, радасныя госці,
Што ў свята ператвораць просты дзень.

***

Гадзіннік не спыняе ход,
Бягуць гады за годам год.
Усё змяняе хуткі час:
Жыццё, пачуцці, звычкі, нас.

І толькі ў нас жыве заўжды
Праз час, праз страты, праз гады
Святая памяць пра дзядоў
І да святой зямлі любоў.

## На прадвесні

Усміхаецца праменьчык,
Свеціць шыбаю акна.
Сонца яркага струменьчык
Сведчыць, што ідзе вясна.

На дварэ цяплее хутка,
Растапляе сонца снег,
Ледзяшы звісаюць купкай,
Слёзы капаюць са стрэх.

Дзень цудоўны, светлы, ясны
Крочыць сцежкаю са мной,
І ад сонечнай усмешкі
Паляпшаецца настрой.

***

Паэзіі чароўны свет
Агорне раптам летуценнем,
Яскравых вобразаў букет
Паўстане безліччу адценняў.

Жывыя фарбы на канву
Патрэбным уплятуцца словам,
Малюнкам яркім ажывуць
Магічнай сілай роднай мовы.

## Нараджэнне Хрыстова

Месяц жывы паглядае праз хмары,
Ранак зімовы ступае нясмела,
Белым ажурам заслаўшы ўладарна,
Рукі і пальцы раскідзістым дрэвам.

А на зямлі – чысціня, як ніколі,
Нават сляды адшукаць цяжкавата,
Снег на кустах і ялінах спакойна
Пышна кладзецца пушыстаю ватай.

Так нараджэнне Хрыстова прырода
Велічна, светла, адметна вітае,
З гэтай цудоўнай і слаўнай нагоды
Звоняць званы меладычна над краем.

Хай жа ачысцяцца грэшныя душы,
Божым святлом ззяе кожная хата,
Веру, надзею, любоў, дабрадушнасць
Людзям нясе надзвычайнае свята.

## Цвілі каштаны

Цвілі на вуліцы каштаны,
Уражваў чысцінёй іх цвет,
А нас дваіх, ад шчасця п'яных,
Азартна мчаў веласіпед.

У захапленні ад спаткання
Кіпела ў сэрцы пачуццё.
На крылах несла нас каханне
У іскрамётнае жыццё.

**Завіруха**

Танцавала завіруха,
Рассыпала снег заўзята,
Лес зімовы сумна слухаў,
Як галіны вецер кратаў.

Завіруха пела-выла,
Пераскоквала па дрэвах,
Пасыпала снежным пылам
Па галінах пасівелых.

Надакучыла сваволіць,
Вецер сцішыўся разбойны,
Перастаў гудзець-скуголіць –
Завіруха спіць спакойна.

Напамінам аб танцорцы
Белы снег ляжыць ад ночы.
Санак след на снежнай горцы
Цешыць радасныя вочы.

***

Звіняць хатынскія званы,
Як душаў стогн, як плач з нябёс,
Як адгалосак той вайны,
Што жудасны прынесла лёс.

**Зіма**

Час
Прэч
Бег.
Дзень
Нёс
Снег.
Скрозь
Бель –
Лёд…
Сплыў
Прэч
Год.

**Грамніцы**

У агромістым сусвеце,
У бязмежнай вышыні
Безліч зорак ярка свецяць,
Дасылаюць нам агні.

Іх святло кранае душы
І здзіўляе хараством,
Толькі чэрствы і бяздушны
Не захопіцца святлом.

Той агеньчык, што на свечцы –
Сімвал веры, чысціні…
Так спрадвеку абярэгам
Нам Грамнічныя агні.

**Вечарам**

Заглядае ў вокны вечар
Летні, ціхі, бестурботны.
Зоркі ў небе, быццам свечкі,
Заміргалі бесклапотна.

Выплыў месячык ігрысты,
Нібы рыба залатая,
Луг і рэчку – усё чыста,
Як пражэктар, асвятляе.

Будзе месяц аж да рання
З рэчкай цесна абдымацца
І, як рыбка залатая,
У вадзе жывой купацца.

**Месяц**

Заблытаўшыся ў веццi сонных дрэў,
Сярод лістоў вялізным ліхтаром,
Начную цішу месяц яркі стрэў,
Халодным прамянеючы святлом.

Цікаўна зазіраючы праз вокны,
Дзівіўся, як пануе сон начны,
А потым, ад дажджу прамоклы,
Схаваўся за фіранкай аблачын.

***

Погляд зорак з павалокай
Млявым точыцца святлом.
Там, у вышыні далёкай,
Іх сапраўдны ціхі дом.

І, здаецца, з тых вяршыняў
Правяць баль яны адны,
У начной нябеснай сіні
Бачаць зоркавыя сны.

Іх загадкавыя тайны
Да канца не разгадаць…
Будуць моўчкі незвычайна
Пастаянна хваляваць.

***

Брукаванкай едзе гром,
Бліскавіца з-пад калёс,
Сыпле на зямлю дажджом
З прадзіраўленых калёс.

Падганяюць перуны
Хмары грузнае крыло…
Змрок рассеяўся начны,
Знікла ўсё, што дзесь гуло.

## ЗМЕСТ

***Ад продкаў скарб з сабой нясу...
***Вечар весні...
На Нарачы
***Раніцай водар вясновых садоў...
***Ўскрай дарогі ў жыце васількі...
***За рэчкаю ў туманах патанула...
***Па расістых травах на світанні рана...
***Неба сінь і мора глыбіню...
Максіму Багдановічу
***Дарога жыццёвая нітачкай ўецца...
Ракуцёўшчына
Уладзіміру Караткевічу
Скарб спадчыны
Зімой
***Творы мастака...
Кветкі восені
Слова
***Год стары амаль ужо мінае...
Лілея
***Твая душа – параненая птушка...
***Мілая Радзіма!..
***Як складаеш вершы?..
Чысціня душы
Зімовы цуд
***Радзіму любяць, бо яна свая...
Настаўнікам нашым
Трывога
***Чараўніца восень зноўку жарты строіць...
Раніца жыцця
Зімовая замалёўка
Пейзаж
***Белыя воблачкі вішань у цвеце...
***Белы, пульхны, лёгкі, чысты...
***Чаму для мамы вершаў не пішу?..
Дзе шукаць шчасце
***Шчаслівы той, хто шчасця не шукае...
Марозны дзень
Снежань
***Не трэба на жыццё нам наракаць...
Санет
***Калі ты побач – добра мне...

***Чаму так хутка час ляціць...
***Між абавязкам і сумленнем...
Хоку
Вянок санетаў
***Сонца на захад хавацца збіраецца...
Летні дождж ык
Новы дзень
***Волаты-дрэвы каля гасцінца...
З каханнем па жыцці
Цёплы ўспамін
***У кожнага свая калыска...
***Бальзамны водар дзікіх траў...
Пакланюся сваёй Беларусі
***З гары высокай над ракою...
Іду…
***Прыроды загадкі, яе таямніцы...
***Ніхто не нап'ецца са студні пустой...
***Якое шчасце мець сяброў...
***Мне настальгічныя прыходзяць думы...
***Гадзіннік не спыняе ход...
На прадвесні
***Паэзіі чароўны свет...
Нараджэнне Хрыстова
Цвілі каштаны
Завіруха
***Звіняць хатынскія званы...
Зіма
Грамніцы
Вечарам
Месяц
***Погляд зорак з павалокай...
***Брукаванкай едзе гром...

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**БЯРЭЗІНА Тамара Іванаўна**

# МІЖ АБАВЯЗКАМ І СУМЛЕННЕМ

Вершы

Рэдактар
*Н. І. Мельнічэнка*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by